УДК 7.096(476)

***У. А. Трапянок,***
*кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт кафедры рэжысуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», г. Мінск, Беларусь*

# РЭПРЭЗЕНТАЦЫЯ ОПЕРНАГА МАСТАЦТВА Ў БЕЛАРУСКІМ РАДЫЁТЭАТРЫ

**Анатацыя.** Распавядаецца, як і калі опера з’явілася ў эфіры Беларускага радыё, якім чынам фарміраваўся фонд музычнага радыётэатра ў ХХ ст., як оперныя спектаклі рэпрэзентуюцца ў сучаснай аўдыяльнай прасторы. На падставе вывучэння факталагічнага матэрыялу з фондаў Беларускага радыё аўтар вылучае перавагу прысутнасці опернага мастацтва ў эфіры на рэпрадукцыйным узроўні, дэманструе разнастайнасць нацыянальнага і прадастаўленага іншымі рэдакцыямі савецкага радыёвяшчання музычнага кантэнту.

**Ключавыя словы:** опера, Беларускае радыё, рэпрэзентацыя, спектакль, музычны радыётэатр, тэатр оперы і балета, трансляцыя, запіс.

***U. Trapianok,***
*PhD in Art History, Associate Professor of the Department of Direction of the Educational Institution “Belarusian State University of Culture and Arts”, Minsk, Belarus*

# REPRESENTATION OF OPERA ART IN THE BELARUSIAN RADIO THEATER

**Abstract.** This article is about how and when opera appeared on Belarusian Radio, how the fund of musical Radio Theater was formed in the 20th century, how opera performances are represented in the modern audio space. Based on the study of factual material from the fund of the Belarusian Radio, the author emphasizes the advantage of the presence of opera art on the air at the reproduction level, demonstrates the diversity of national and provided by other editors of Soviet radio music content.

**Keywords:** opera, Belarusian Radio, representation, performance, musical Radio Theater, Opera and Ballet Theater, broadcast, recording.

Аўдыяльная прырода оперы і радыё пасадзейнічала з’яўленню ў медыяпрасторы новых сінтэзаваных форм прэзентацыйнага (стваральнага/прадукцыйнага) і рэпрэзентацыйнага (рэтрансляцыйнага/рэпрадукцыйнага) узроўняў мастацкага вяшчання.

Паколькі прэзентацыя разумеецца як першаснае, нескажонае прадстаўленне арыгінальных твораў, яскравым прыкладам стваральнага ўзаемадзеяння сродку масавай камунікацыі і роду музычна-драматычнага твора з'яўляецца радыёопера. Рэпрэзентацыя, якая стала неад'емнай часткай сучаснага мастацтва [1, с. 57], прадугледжвае другасную перадачу першавобраза мастацкай практыкі ў той ці іншай публічнай прасторы, у тым ліку ў радыёэфіры. Прамыя і радыётрансляцыі ў запісе оперных спектакляў з тэатральных і канцэртных залаў адносяцца да рэпрэзентацыйнага ўзроўню, паколькі прадстаўляюць самастойны тэатральны твор у аўдыяльным медыя.

Опера ў розных формах яе перадачы сродкамі радыёвяшчання ўваходзіць у структуру музычнага радыётэатра, дамінантай якога з'яўляецца музычны складнік [5, с. 29]. Мэтай гэтага артыкула мы вызначылі выяўленне гістарычных і сучасных асаблівасцей функцыянавання опернага мастацтва ў айчынным радыётэатры. У якасці эмпірычнай базы выкарыстаны матэрыялы з фанатэкі Беларускага радыё.

Опернае мастацтва з'явілася ў эфіры Беларускага радыё ў перыяд яго станаўлення, што ахапіў 1925–1932 гг. Першыя трансляцыі оперы на рэпрэзентацыйным узроўні адбыліся ў пачатку 1927 г., пра што сведчыць артыкул Ф. Шынклера, размешчаны ў лютаўскім нумары газеты «Звязда» за 1927 г., у якім адзначалася, што радыё дае оперы маскоўскіх тэатраў [7].

Магчымасці музычнага вяшчання змяніліся ў 1928 г. пасля пачатку дзейнасці на радыё вялікага сімфанічнага аркестра. Гэта пасадзейнічала павелічэнню ў эфіры колькасці «сур'ёзнай» музыкі, выкананай «ужывую», у тым ліку твораў беларускіх кампазітараў А. Туранкова, М. Аладава, Р. Пукста, В. Залатарова, Я. Цікоцкага, а таксама з'яўленню арыгінальнай試 опернай музыкі. Напрыклад, у 1930 г. да эфіру рыхтавалася першая айчынная опера-жарт «Тарас на Парнасе», музыку да якой напісаў М. Аладаў [4, с. 26]. Гэты факт сведчыць пра пошукі творча-вытворчых магчымасцей тагачаснага радыё, пашырэнне музычнага дыяпазону вяшчання, а таксама спробы выхаду на прадукцыйны ўзровень працы з оперным матэрыялам і зараджэння нацыянальнай радыёоперы – «разнавіднасці оперы XX ст., своеасаблівага самастойнага жанру музычна-тэатральнага мастацтва» [2, с. 288].

У пачатку 1930-х гг. быў утвораны мастацкі аддзел Беларускага радыё, у функцыі якога ўваходзіла забеспячэнне эфіру музычным кантэнтам. Большасць музычных перадач ішла пад рубрыкай «Радыётэатр» [4, с. 58], што тлумачылася іх дастатковай працягласцю па часе, формай «зборны канцэрт», «прамая трансляцыя», а таксама ўмовамі, у якіх выконвалася музыка – у невялікай зале збіраліся гледачы і стаяла абсталяванне, што забяспечвала перадачу кантэнту ў радыёэфір. Да сярэдзіны 1930-х гг. быў сфарміраваны план музычных перадач з дзевяці цыклаў, якія шырока прадстаўлялі нацыянальнае і замежнае музычнае мастацтва, а таксама ўплывалі на фарміраванне мастацкіх густаў аўдыторыі. Адзін з цыклаў прадугледжваў рэпрэзентацыю опернага мастацтва, фарміраваўся пераважна са зманціраваных спектакляў, якія ішлі ў Маскве – «Барыс Гадуноў», «Царская нявеста», «Вяселле Фігара» і інш. [Там жа, с. 59]. З выбраных арый згодна з асобым раздзелам плана фарміраваліся праграмы «Пасляабедзенны канцэрт», «Вячэрні канцэрт», «Канцэрт», «Канцэрт для выхаднікоў» і інш. [6].

У эфіры Беларускага радыё ў чэрвені 1940 г. ладзіліся музычныя трансляцыі з Першай дэкады беларускага мастацтва і літаратуры ў Маскве. У прыватнасці, Дзяржаўным тэатрам оперы і балета Беларусі былі паказаны оперныя спектаклі «Міхась Падгорны» Я. Цікоцкага, «Кветка шчасця» А. Туранкова, «У пушчах Палесся» А. Багатырова, радыёслухачам жа сталі даступнымі рэпрэзентаваныя ўзоры нацыянальнай оперы.

У гады вайны, калі рэдакцыя Беларускага радыё была эвакуіравана, вяшчанне радыёстанцыі «Савецкая Беларусь» вялося з Масквы, аб'ёмы і разнастайнасць музычнага эфіру скараціліся. Праслухоўванне радыё на тэрыторыі нашай краіны было пад забаронай, аднак асаблівай папулярнасцю ў партызан карысталіся канцэрты па заяўках [4, с. 85]. Супрацоўнікі рэдакцыі па магчымасці запрашалі ў студыю вядомых дзеячаў мастацтва, сярод якіх, у прыватнасці, спевакі Л. Александроўская, Р. Млодак, І. Балоцін. Можна толькі меркаваць, што ў выкананні гэтых артыстаў зрэдку маглі гучаць арыі з опер беларускіх ці замежных кампазітараў. Такое ж нясмелае меркаванне аб прысутнасці оперы можна выказаць датычна зместу канцэрта беларускага мастацтва, які трансліраваўся з Масквы 18 мая 1942 г. з удзелам спевакоў з Беларусі і салістаў

Маскоўскага музычнага тэатра імя К. Станіслаўскага і У. Неміровіча-Данчанкі [Там жа, с. 86].

У пасляваенныя гады, калі вяшчанне радыёстанцыі імя Савета Народных Камісараў БССР аднавілася з Мінска, музычная частка эфіру заняла палову ад усяго рэспубліканскага вяшчання. Рэгулярнымі стваральнікамі музычнага радыёкантэнту сталі сімфанічны аркестр пад кіраўніцтвам Т. Каламійцавай і салісты Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Беларусі, а таксама артысты Беларускай філармоніі – Л. Александроўская, Т. Ніжнікава, М. Ворвулеў, І. Балоцін і інш.

З’яўленне запісу і мантажу ў сярэдзіне XX ст. паклалі пачатак фарміраванню радыёфондаў, пэўную долю якіх, несумненна, займала опернае мастацтва. У рэпертуары музычнага радыётэатра з’явіліся спектаклі, партыі ў якіх выконвалі салісты беларускай оперы, а таксама запрошаныя замежныя спевакі, сярод якіх, у прыватнасці, артысты Шаасінскай оперы (Кітай) і саліст Сафійскай оперы Дзмітр Узунаў (Балгарыя) [3, с. 36]. Аднымі з першых запісаных для радыё нацыянальных опер сталі «Машэка» Р. Пукста (запіс 1949 г.), «Міхась Падгорны» (1951) і «Дзяўчына з Палесся» Я. Цікоцкага (1953), «Марынка» Р. Пукста (1956), «Надзея Дурава» А. Багатырова (1957), «Яснае світанне» і «Кветка шчасця» А. Туранкова (1958). На сярэдзіну XX ст. прыпала з’яўленне беларускай дзіцячай радыёоперы – у 1951 г. фонды папоўніліся запісам оперы М. Чуркіна «Рукавічка» на лібрэта Л. Варанковай. Сусветная класіка была прадстаўлена, у прыватнасці, запісам 1952 г. оперы «Кармэн» Ж. Бізэ ў выкананні артыстаў Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Беларусі.

Другая дэкада Беларускага мастацтва і літаратуры, якая адбылася ў лютым 1955 г. у Маскве, стала нагодай для трансляцыі ў радыёэфіры твораў Дзяржаўнага тэатра оперы і балета «Страшны двор» С. Манюшкі, «Дзяўчына з Палесся» Я. Цікоцкага, «Яўген Анегін» П. Чайкоўскага [4, с. 125]. Запісы апошніх дзвюх пастановак захоўваюцца ў фанатэцы Беларускага радыё.

Практыка запісу оперных спектакляў у тэатрах Мінска, Масквы, іншых гарадоў былога Савецкага Саюза і шырокай рэпрэзентацыі оперы на Беларускім радыё працягвалася да пачатку 1990-х гг. У фонды за 1960-я гг. увайшлі, у прыват-

насці, пастаноўкі Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР: «У пушчах Палесся» А. Багатырова (1960), «Калючая ружа» Ю. Семянякі (1961), «Яснае світанне» А. Туранкова і «Заручыны ў манастыры» С. Пракоф'ева (1964); Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра СССР: «Пікавая дама» П. Чайкоўскага (1962), «Фальстаф» (1963) і «Дон Карлас» Д. Вердзі (1964), «Царская нявеста» і «Снягурачка» М. Рымскага-Корсакава (1966), «Тоска» Д. Пучыні (1967), «Невядомы салдат» К. Малчанава (1969); Маскоўскага музычнага тэатра імя К. Станіслаўскага і У. Неміровіча-Данчанкі: «Кацярына Ізмайлава» Д. Шастаковіча (1964), «Цаною жыцця» А. Нікалаева (1967); Акадэмічнага тэатра оперы і балета Украінскай ССР: «Тарас Бульба» М. Лысенкі і «Назар Стадоля» К. Данькевіча (1965); творы Усесаюзнага радыё: «Замак герцага Сіняя Барада» Б. Бартака (1965), «Пушкін у выгнанні» Б. Шэхтэра (1967), «Арлеанская дзева» П. Чайкоўскага (1969 г., сумесна з Вялікім тэатрам СССР) і інш.

Адметнымі творамі, якія папоўнілі фонды беларускага радыётэатра 1970-х гг., сталі оперы, пастаўленыя на сцэне Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Беларусі, – «Зорка Венера» Ю. Семянякі (1970), «Фауст» Ш. Гуно (1972), «Лаэнгрын» Р. Вагнера і «Джардана Бруна» С. Картэса (1977); оперныя спектаклі Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра СССР «Майская ноч» М. Рымскага-Корсакава (1971), «Іван Сусанін» М. Глінкі і «Яўген Анегін» П. Чайкоўскага (1979); радыёоперы Усесаюзнага радыё «Чаравічкі» (1973) і «Чарадзейка» (1974) на музыку П. Чайкоўскага.

Сярод фондавых запісаў 1980-х гг., якія рэпрэзентуюць тагачасныя спектаклі Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Беларусі, – «Служанка-пані» Д. Б. Пергалезі (1981), «Новая зямля» Ю. Семянякі (1982), «Моцарт і Сальеры» М. Рымскага-Корсакава (1984), «Чароўная флейта» В. А. Моцарта (1988), «Русалка» А. Даргамыжскага (1989) і інш. Рэпертуар айчыннага музычнага радыётэатра 80-х гг. XX ст. папоўнілі запісы, прадастаўленыя па абмене іншымі рэдакцыямі савецкага радыёвяшчання. Сярод рэпрэзентаваных пастановак – «Тоска» Д. Пучыні (Дзяржаўны акадэмічны Вялікі тэатр СССР, 1981 г.); творы Маскоўскага музычнага тэатра імя К. Станіслаўскага і У. Неміровіча-Данчанкі «Кармэн» Ж. Бізэ (1982), «Сарочын-

скі кірмаш» і «Жаніцьба» М. Мусаргскага (1983); «Алкід» Д. Бартнянскага (Кіеўскі камерны аркестр, салісты, 1985 г.); «Вій» В. Губарэнкі (Адэскі тэатр оперы і балета, 1985 г.); «Музыка для жывых» Г. Канчэлі (Тбіліскі тэатр оперы і балета, 1987 г.); «Утаймаванне свавольніцы» В. Шабаліна (Саратаўскі тэатр оперы і балета, 1987 г.) і інш.

На мяжы 1980–1990-х гг. для радыё запісаны пастаноўкі Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Беларусі «Дзікае паляванне караля Стаха» на музыку У. Солтана (1990), «Тоска» Д. Пучыні (1991), «Аіда» Д. Вердзі (1991) і інш.

Адзінкавыя прыклады арыгінальнай беларускай радыёоперы (дзіцячая опера-казка Д. Лукаса «Рак-вусач» (1962), «Барвовы золак» К. Цесакова (1979), «Зорка Венера» Ю. Семянякі (1979), «Сівая легенда» Д. Смольскага (1984) і інш.) сведчаць, што асноўны аб’ём музычнага вяшчання опернага кірунку ў савецкі перыяд займалі рэтрансляцыі опер, падрыхтоўка якіх да эфіру не вымагала вялікіх затрат – якасны запіс у тэатры і мінімальны мантаж забяспечвалі належны ўзровень рэпрэзентацыі пастаноўкі.

У апошняе дзесяцігоддзе XX ст., калі Беларускае радыё перайшло на самастойны шлях развіцця і фарміравання ўласнай вяшчальнай палітыкі, рэпертуар музычнага радыётэатра дапоўнілі, у асноўным, оперы айчынных кампазітараў і здабыткі рускай класікі – арыгінальныя радыётворы і рэпрэзентаваныя сцэнічныя версіі. У фонды, у прыватнасці, былі ўключаны запісы оперных салістаў і сімфанічнага аркестра Беларускага радыё «Францыск Скарына» Д. Смольскага (1992), «Агатка, або Прыезд пана» Я. Д. Голанда (1994), «Фауст» А. Г. Радзівіла (1997), а таксама радыёмантажы спектакляў Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь «Візіт дамы» С. Картэса і «Царская нявеста» М. Рымскага-Корсакава (1996), «Кацярына Ізмайлава» Д. Шастаковіча, «Яўген Анегін» П. Чайкоўскага і «Князь Ігар» А. Барадзіна (1997), «Барыс Гадуноў» М. Мусаргскага (1998), «Рыгалета» Д. Вердзі (1999), «Кармэн» Ж. Бізэ (2000).

Трансляцыі опер у сучасным радыёэфіры адбываюцца на спецыялізаваным канале «Культура». У напаўненні тэматычных перадач выкарыстоўваюцца пераважна запісы мінулых дзесяцігоддзяў, якія сёння складаюць «залаты фонд» Бела-

рускага радыё. Прамыя трансляцыі, запісы сучасных оперных спектакляў зведзены да мінімуму. У якасці адзінкавага прыкладу рэпрэзентацыі ў XXI ст. можна назваць запіс оперы М. Мусаргскага «Барыс Гадуноў», які дапоўніў фонды ў 2008 г. У эфіры канала «Культура» зрэдку можна паслухаць музычныя спектаклі з удзелам сусветна вядомых оперных выканаўцаў (невялікая колькасць падобнага кантэнту, запісанага ў XX ст., захоўваецца ў фанатэцы), а таксама сучасныя еўрапейскія запісы, якія актуалізуюць сусветную оперную спадчыну (з прыватных калекцый музычных рэдактараў).

Такім чынам, рэпрэзентацыя оперных пастановак сродкамі радыё стала запатрабаванай ужо ў першыя гады вяшчання (з другой паловы 1920-х гг.), калі наладжваліся трансляцыі з музычных тэатраў Масквы, а таксама пачаў дзейнічаць сімфанічны аркестр Беларускага радыё, які выконваў, у тым ліку, оперную музыку. Пасля тэхнічных пераўтварэнняў у сярэдзіне XX ст., якія дазволілі фіксаваць спектаклі на магнітную плёнку, рэпертуар айчыннага музычнага радыётэатра дапоўніўся запісамі з Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Беларусі, нешматлікімі творамі арыгінальнай нацыянальнай радыёоперы, а таксама радыёмантажамі спектакляў, зробленымі супрацоўнікамі іншых савецкіх рэдакцый. Фондавыя творы з’яўляюцца асноўным кантэнтам для падрыхтоўкі сённяшніх музычных перадач, прысвечаных оперы. Рэпрэзентацыя сучасных оперных пастановак на Беларускім радыё зведзена да мінімуму.

1. *Бабич, Т. Н.* Репрезентация артефактов в современном искусстве: теория и практика / Т. Н. Бабич // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2014. – № 1 (21). – С. 56–65.

2. *Мдывані, Т.* Радыёопера / Т. Мдывані // Тэатральная Беларусь : энцыклапедыя : у 2 т. / пад агул. рэд. А. В. Сабалеўскага. – Мінск, 2003. – Т. 2 / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – С. 288–290.

3. *Пяркоўскі, Б. Б.* Радыёвяшчанне і тэлебачанне ў Беларускай ССР / Б. Б. Пяркоўскі. – Мінск : Дзярж. выд-ва БССР, 1957. – 53 с.

4. *Радкевіч, Я. Р.* Беларускае радыё: гісторыя, перспектывы развіцця / Я. Р. Радкевіч. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1983. – 197 с.

5. *Трапянок, У. А.* Спецыфіка развіцця радыётэатра ў медыяпрасторы Беларусі / У. А. Трапянок ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2019. – 208 с.

6. Увага! Гаворыць Мінск! : Радыёстанцыя імя Саўнаркома БССР на хвалі 1442 метраў : Радыёпраграммы. – Мінск : Усебеларус. Радыёкамітэт пры СНК БССР, 1934. – 75 с.
7. *Шинклер, Ф.* Внимание, радио! / Ф. Шинклер // Звязда. – 1927. – 16 февр. – С. 4.

УДК 78.083(510)

***И. В. Ухова,***
*кандидат искусствоведения, доцент,*
*профессор кафедры музыкально-теоретических дисциплин*
*учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств», г. Минск, Беларусь*

# КИТАЙСКАЯ ИНСТРУМЕНТАЛЬНАЯ МИНИАТЮРА В КУРСЕ АНАЛИЗА МУЗЫКАЛЬНЫХ ФОРМ

**Аннотация.** Рассматривается возможность включения в курс анализа музыкальных форм китайской инструментальной миниатюры в качестве учебного материала. В первую очередь это касается фортепианных пьес китайских композиторов, написанных в простой и сложной трехчастной форме. Интерес для анализа представляет соединение в этих сочинениях структурных, гармонических, фактурных особенностей европейской музыки с национальным образным строем, тематизмом, ладовым колоритом.

**Ключевые слова:** анализ музыкальных форм, трехчастная форма, инструментальная миниатюра, китайская фортепианная музыка.

***I. Ukhova,***
*PhD in Art History, Associate Professor, Professor of the Department of Music and Theoretical Disciplines of the Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts", Minsk, Belarus*

# CHINESE INSTRUMENTAL MINIATURE IN THE COURSE OF ANALYSIS OF MUSICAL FORMS

**Abstract.** The article considers the possibility of including the analysis of musical forms of Chinese instrumental miniature in the course as an educational material. First of all, this applies to piano pieces by Chinese composers, written in simple and complex three-part forms. Of interest for analysis is the combination in these compositions of structural, harmonic, and textured features of European music with a national figurative structure, thematism, and fret color.